Цана 15 гр. „Biełaruski Front“ 15 marca 1939 r. Przesyłka opłacona ryczałtem

БЕЛАРУСКІ ФРОНТ

ВЫХОДЗІЦЬ 1-га і 15-га КОЖНАГА МЕСЯЦА

РЭДАКЦЫЯ і АДМІНІСТРАЦЫЯ:
Вільня, Вострабрамская вул. 1 — 20 (Wilno, ul. Ostrobramska 1 — 20).
Адчынена ад 9 да 19 г.

Выпіска: на год — 2 зал., на паўг. — 1 зал., на 3 м-цы — 50 гр.
Нумар конта паштовага разрахунку: 100

НЕЗАЛЕЖНЫ НАРОДНА-РАДЫКАЛЬНЫ ЧАСАПІС

№ 6 (40) Вільня, 15 сакавіка 1939 г. Год IV

У ДВАЦЦАЦЬ ПЕРШЫЯ ЎГОДКІ.

25 сакавіка сёлета мінае 21 год ад дня Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, як выбраная прадстаўніца Агульна-Беларускага Кангрэсу, дня 25 сакавіка 1918 году ў Менску абвесьціла Беларусь незалежнай і вольнай. Факт гэты належыць ужо да гісторыі і дзеля гэтага мы падойдзем да яго з гістарычнага пункту гледжаньня.

Для людзей, якія стаялі і стаяць воддаль ад гэтага факту, зьяўляецца часта незразумелым, чаму беларускі народ не патрапіў тады зрэалізаваць гэтай пастановы сваіх прадстаўнікоў. Аднак, прыглядаючыся зусім аб'ектыўна да тагачасных нутраных і вонкавых абставін, трэба прызнаць, што нутр. абставіны былі вельмі неспрыяючыя для рэалізацыі гэтай вялікай пастановы.

Як ведама з практыкі ўсіх народаў, для рэалізацыі незалежнасьці патрэбны *два варункі:* першы — сьпеласьць народу да гэтага вялікага акту, другі — спрыяючыя вонкавыя абставіны.

Адносна першага варунку трэба сьцьвердзіць, што Беларускі народ у сваей масе ў той час яшчэ гэтай незалежнасьці не разумеў. Як мы ўжо пісалі ў мінулым годзе („Бел. Фр.“ 5.IX.38), патрэбу незалежнасьці разумелі ў 1918 г. толькі „вярхі“ беларускага народу ў асобе малой тады яшчэ на лік беларускай інтэлігенцыі, а „нізы“ на ўсе довады аб патрэбе незалежнасьці адказвалі пасвоему: „у Беларусі няма солі і газы“... Мала памагалі доказы, што без свае солі і газы існуе шмат дзяржаваў і што за плады свайго краю выпісваюцца з заграніцы ня толькі соль і газа, але і важнейшыя прадметы!.. Народныя масы ў той час незалежнасьці не разумелі. Ані розум (сьведамасьць) беларускіх народных масаў, ані іх воля яшчэ ня былі прыгатаваны да такой вялікай справы, як рэалізаваньне незалежнасьці.

Адносна другога варунку трэба прызнаць, што палітычныя абставіны дзеля будаваньня незалежнасьці былі ў той час вельмі спрыяючымі, як рэдка калі ў гісторыі. Расейская імпэрыя, справядліва названая турмою народаў, развалілася, усе паняволеныя ею народы, якія дасьпелі да незалежнасьці, будавалі свае аддзельныя, самастойныя дзяржавы. Беларускія дзеячы не маглі астацца ззаду, бо патражала вялікая небясьпека, што чужыя сілы, сарганізаваўшыся перш за беларусаў, могуць захапіць для сябе часьці беларускай тэрыторыі, карыстаючыся тым, што гэта тэрыторыя яшчэ ня мела гаспадара... Найбольшым ворагам незалежнасьці Беларусі зьяўляліся тады паміж іншымі і бальшавікі. І гэта зразумела. Яны атрымалі ў спадчыне расейскі цэнтралізм і выступілі на палітычную арэну як вялікія ворагі ўсякіх вызвольных ад Расеі імкненьняў; апроч гэтага яны паставілі сабе мэтай злучыць усе народы сілаю ў камуністычным саюзе (Камінтэрне). Значыць, бальшавікі былі (і ёсьць) прыроднымі ворагамі незалежнасьці Беларусі.

Беларускія дзеячы ў Менску ясна здавалі сабе справу, што першым варункам рэалізацыі незалежнасьці ёсьць сьведамасьць народу аб патрэбе гэтай незалежнасьці і воля здабыць яе; а другім варункам ёсьць прызнаньне гэтай незалежнасьці іншымі дзяржавамі. У той час гэтакіх дзяржаваў ня было.

Англія і Францыя ніколі не былі заінтарасаваныя ў паўстаньні незалежнай Беларусі. Будучы натуральнымі ворагамі Нямеччыны, яны заўсёды дзяржаліся тэй лініі, каб стварыць на ўсход ад Нямеччыны як найсільнейшую дзяржаву. Існаваньне сільнага дзяржаўнага арганізму на Ўсходзе (бяз розьніцы, расейскага ці польскага) заўсёды ляжала ў іх інтарэсах. Дзеля гэтага тварэньне новых дзяржаўных арганізмаў, якія-б аслаблялі Расею, ня было згодна з іх інтарэсамі і не магло выклікаць у іх спагаднасьці.

Японія тады была саюзьніцай Англіі і Францыі, а нават і Расеі і ня ўмешвалася ў далёкія эўрапэйскія справы. Нямеччына ня мела ясна выпрацаванай лініі на ўсходзе: раз яна хацела захаваць вялікую Расейскую імпэрыю і ўвайсьці з ею ў саюз, другі раз яна імкнулася да аслабленьня яе пры помачы бальшавікоў, паддзержываючы ў ёй бязупыннае рэвалюцыйнае бурленьне і выкарыстоўваючы яе сыравіны. Ніякай Беларусі ў 1918 годзе Нямеччына не прызнавала. Паводле Берасьцейскага міру Нямеччына перад бальшавікамі забабвязалася не тварыць на савецкім абшары ніякіх новых дзяржаўных арганізмаў (гэтае забавязаньне датычыла ў першую чаргу Беларусі), апроч гэтага Нямеччына хацела мець беспасярэднія зносіны з абшырным расейскім рынкам, а такія зносіны магчымы былі толькі праз этнаграфічную беларускую тэрыторыю. З гэтых прычын Нямеччына адхіляла ўсе стараньні беларусаў у справе прызнаньня незалежнасьці Беларусі. Нямецкія дэцыдуючыя дзейнікі ўсьцяж заяўлялі беларусам, што ў справе незалежнасьці Беларусі яны павінны паразумецца з бальшавікамі, бо гэта ёсьць нутраная справа заселяючых Расею народаў...

Гэтак прадстаўлялася справа рэалізацыі незалежнасьці Беларусі ў 1918 годзе. Цяпер гэта справа прадстаўляецца інакш. Сьведамасьць і воля беларускага народу ў Саветах, як аб гэтым ідуць бязупынныя весьці, узрасла за гэтыя 21 год значна, дзеля гэтага камуністычныя ўлады ліквідуюць беларускіх палітычных дзеячоў і нават культурных працаўнікоў, праводзяць ліквідацыю беларускага нацыянальнага пачуцьця ў масах, стараюцца праз „рэформу“ беларускага правапісу і граматыкі праблізіць беларускую мову да расейскай. Але паміма ўсяго нацыянальная беларуская сьведамасьць і воля да здабыцьця незалежнасьці там расьце. Вонкавыя абставіны таксама пераманіліся. Праўда, Англія і Францыя асталіся пры старых пагладах і справай незалежнасьці Беларусі не інтарасуюцца або адносяцца да яе варожа, затое Японія і Нямеччына зьмянілі сваё становішча і цяпер заінтарасаваны ў падзеле Расеі на паасобныя нацыянальныя дзяржавы. Гэтага самага пагляду дзяржацца некаторыя польскія дзейнікі (промэтэісты).

ПАДЗЕІ НА БЛІЗКІМ УСХОДЗЕ.

Гаворачы ў папярэднім нумары „Бел. Фронту“ аб сусьветнай мабілізацыі сіл, мы зьвярнулі асаблівую ўвагу на два пункты гэтай мабілізацыі: першы пункт — гэта Захад Эўропы (Гішпанія, Бэльгія, Галяндыя), другі пункт — гэта Ўсход Эўропы (Балканы, Румынія, Вугрыя, Чэхаславаччына, Польшч, Прыбалтыка). Як на Захадзе так і на Ўсходзе мабілізацыя паволі прыходзіць да канца, палажэньне выясьняецца, дзяржавы дэцыдуюцца з кім ісьці, куды і пашто. Нас тут інтарасуюць пляны ня толькі вялікіх дзяржаў (Англіі, Францыі, Нямеччыны, Італіі), але сярэдніх і малых, якія ляжаць на Ўсходзе Эўропы.

Ня трэба хіба ўспамінаць, што галоўнымі мотарамі палітычных камбінацыяў на блікім Усходзе зьяўляюцца дзьве дзяржавы: Англія і Нямеччына. Аб нямецкіх плянах на Ўсходзе мы ўжо пісалі у папярэдніх нумарох „Б. Ф.“ і дзеля гэтага іх паўтараць ня будзем. Англія да гэтых плянаў спачатку адносілася роўнадушна, а нават спрыяюча: няхай, маўляў, Нямеччына ідзе сабе на Ўсход, тады прынамся будзе спакайней на Захадзе і Нямеччына ня будзе выступаць з жаданьнем калёніяў. Але потым, калі выявіліся пляны будаваньня паміж Бэрлінам і Токіё **вялікага шляху**, маючага на мэце злучыць праз Усх. Эўропу (Украіну, Дон, Каўказ) і Зах. Азію (Пэрсію, расейскі і кітайскі Туркестан) двух найбольшых ворагаў Англіі, Нямеччыны і Японіі, Англія пераходзіць да рашучага контрнаступленьня, каб да гэтага злучэньня не дапусьціць. Цяпер мы зьяўляемся сьведкамі гэтага контрнаступленьня.

Англія пачала ад **Югаславіі**, дзе пару месяцаў таму быў князь Кэнту, брат англійскага караля (пасьля гэтага князь Кэнту быў прыватна і ў Польшчы, як госьць польскай арыстакрацыі). Бадай адначасна быў у Лёндыне румынскі кароль Караль II, які пасьля павароту з Лёндыну і гутаркі з Гітлерам у Бэрхтэсгадэн (Караль II заяжджаў туды пры павароце з Лёндыну) пачаў востра ліквідаваць сваіх фашыстаў, якія ар'ентаваліся на Бэрлін. Пасьля гэтага **Румынія** атрымала ад Англіі значныя крэдыты і здэцыдавана павярнула ў бок Англіі. Зараз потым прыйшла чарга на Чэхаславаччыну і там цяпер адбываюцца цікавыя падзеі.

Чэхаславаччына пасьля трагічных вераснёвых дзён, калі, пакінутая сваімі саюзьніцамі, прымушана была ўступіць Нямеччыне Судэты з усімі ўкрапленьнямі і нават уваружэньнем іх (чэская лінія Мажыно), зар'ентавалася на Нямеччыну, як на дэцыдуючую ў Эўропе дзяржаву. Англія і Францыя ў верасьні не маглі даць помачы і нават не разумелі патрэбы яе. Цяперважа, калі Англія зразумела ўсю небясьпеку нямецкага паходу на Ўсход, яна пачала рабіць вялікія стараньні, каб Чэхаславаччыну прыцягнуць на свой бок. Відаць, зрабіла ёй нейкія абяцаньні, магчыма,

абяцалася, што ў прыпадку новага нямецкага наступу, яна стане ў яе абароне, хоцьбы дайшло да сусьветнай вайны... У рэзультаце Чэхаславаччына павярнула таксама ў бок Англіі. Цяпер там праводзіцца ліквідацыя тых асяродкаў, якія ар'ентаваліся на Бэрлін, у першую чаргу Славакіі і Карп. Украіны. Гэтыя краіны імкнуліся да таго, каб цалком унезалежніцца ад Чэхіі і хоць не хацелі ад яе адрывацца, то выкідалі проч чэскіх урадаўцаў, чэскіх вучыцялёў, назначаючы на ўсе мясцы сваіх людзей. Гэта было да неўспадобы чэхам. Карыстаючыся з таго, што Гітлер зьвярнуўся на захад, чэскі ўрад пачаў ліквідаваць тыя элемэнты ў Славакіі і Карп. Украіне, якія стаялі **за незалежнасьць.** Быў звольнены міністар Карп. Украіны Рэвай, які востра выступаў процiў Прагі, а на яго месца назначаны болей угадовы мін. Клочурак; зараз потым быў адсунуты ад улады ўвесь славацкі ўрад прэм'ера Тіссо, а на яго месца назначаны новы з прэм'ерам Сідарам на чале, пры гэтым некалькі славацкіх міністраў было арыштаваных. На іх месца назначаны таксама славакі, але болей угадовыя. (Як відаць, тактыка чэхаў адносна славакаў падобна да тактыкі рас. камуністаў адносна беларусаў у БССР). Вялікай помачай для чэхаў у правядзеньні іхных пастановаў быў факт, што да гэтай пары як у Славакіі так і ў Карпацкай Украіне стаялі чэскія гарнізоны. Усе стараньні славакаў і карпатаўкраінцаў, каб стварыць сваё войска, асталіся без рэзультатаў. У іх былі толькі стралецкія фармацыі (гвардыя кс. Глінкі — у славакаў, а січовыя стральцы — у карпатаўкраінцаў), але ў іх нястача ўзбраеньня і выробленнасьці рэгулярнай арміі. Дзеля гэтага ўсе іх сутычкі з рэгулярнай чэскай арміяй кончыліся для іх паражэньнем. Трэба прызнаць, што падзеі ў Чэхаславаччыне вельмі цікавы і будуць, здаецца, паглыбляцца штораз болей. Уклад сіл у гэтай дзяржаве такі, што славакі і карпатаўкраінцы ар'ентуюцца на Нямеччыну, а чэхі — на Англію і, у апошнім часе, на Польшч. Адсунуты ад улады славацкі прэм'ер Тіссо паехаў да Гітлера, просячы інтэрвэнцыі...

Што датычыць **Польшчы,** дык мы яе палітыку прасьледзім паводле заявы мін. Бэка, якую ён зрабіў у Заграмічнай Камісіі Сэнату (11.III) пасьля пацьвярджэньня ўмоваў з Літвою. Датычна **Чэхаславаччыны** мін. Бэк заявіў, што адносіны з ёю, пасьля гутарак прадстаўніка Польшчы з чэскім мін. загр. спраў Хвалькоўскім, увайшлі на **новыя шляхі.** Гэтыя шляхі пачынаюцца ад верасьнёвых падзеяў, якія глыбока страсанулі жыцьцём. Польшч прыгэтым направіла крыўду, зробленую чэхамі ў 1919 г. і далучыла Заользе. Польшч прыканана, што цяпер Чэхаславаччына ня будзе загараджаць ёй дарогі на поўдзень, да тых народаў з якімі яе лучаць эканамічныя ці культурныя зносіны. Адкрытая дарога на поўдзень ёсьць для Польшчы істотным элемэнтам яе палітыкі. Апроч гэтага Польшч ня можа пагадзіцца з тым фактам, што ўсе проціўпольскія дзейнікі мелі заўсёды прыпынак у Чэхаславаччыне. Польшч над гэтым ня можа перайсьці да парадку дня. Паводле гэтых правіл Польшч будзе рэгуляваць сваю палітыку адносна Чэхаславаччыны. Прыкарпацкая Русь павінна быць далучана да Вугрыі. З **Румыніяй** наступіла глыбокае паразуменьне ва ўсіх тэрыторыяльных справах у наддунайскім басэйне. У справе адносін вялікіх дзяржаў да Украіны мін. Бэк сьцьвердзіў, што ўкраінская справа ня была дагэтуль афіцыяльна пастаўлена ніводнай дзяржавай і што гэтая справа зьяўляецца болей справай заінтарасаваньня прэсы, чым дыплямацыі. Украінская праблема інтарасуе польскую палітыку і дзеля геаграфічнай сытуацыі, затым укр. справа бяз удзелу Польшчы вырашана быць ня можа. Напружаньне паміж Польшчай і **Саветамі** адсунена, ясная і выразная палітыка Польшчы пазволіла пры помачы ўзаемнай дэклярацыі залагодзіць напружаньне, якое паўстала ў мінулым годзе з прычыны іншых дзяржаў (Чэхаславаччыны і Літвы — рэд.). Урэгуляваньне палажэньня польскай меншасьці ў **Нямеччыне** а нямецкай у Польшчы мае наступіць на аснове дэклярацыі. Справа **Гданска,** вельмі трудная і запутаная, была яшчэ болей скамплікаваная апошнімі выпадкамі, але вызначаная адумысловая камісія мае зьліквідаваць гэтыя камплікацыі і даць магчымасьць польскім студэнтам вучыцца на гданскай палітэхніцы. **Прыбалтыцкія дзяржавы** ёсьць раёнам, якім Польшч не інтарасавацца ня можа. Там палітычныя адносіны разьвіваюцца на здаровым грунце. Польшч адносіцца да гэтых дзяржаў з цэлай сымпатыяй. Прыязныя да іх адносіны ёсьць традыцыяй польскай палітыкі. Польшч паставіла на міжнародным грунце **справу калёніяў,** якія ёй патрэбны ў галіне эміграцыі і сыравіны.

Гэтакія ёсьць аснаўныя лініі польскай палітыкі. Трэба ў іх добра ўчытацца, каб зразумець цяперашні яе кірунак. Франц. газэта „Paris Midi" піша, што мін. Бэк арганізуе блёк з Польшчы, Румыніі, Югаславіі, Грэцыі, Баўгарыі і Турцыі; гэты блёк, зложаны з 100 мільёнаў людзей, будзе проціўстаўлены нямецкім аўтострадам на Усход, а нямецкаму каналу Рэйн—Дунай будзе проціўстаўлены канал Вісла —Дунай і шлях Гдыня — Салёнікі. Гэту акцыю можа ўспамагчы сваімі капіталамі Францыя і Нямеччына. Румынія ўжо пакінула сваё апазыцыйнае становішча адносна супольнай польска-вугорскай граніцы...

Гэткія падзеі адбываюцца на Блізкім Усходзе. Падалі мы тут „голыя факты", а вывады няхай зробяць самі чытачы. Да гэтых фактаў дадаём яшчэ адзін: Нямеччына на ўсялякі выпадак пачала будаваць вялізарныя ўкрапленьні на сваей усходняй граніцы. Пры будове ўкрапленьняў працуе каля 500 тысяч работнікаў. Пасланы туды нават тыя работнікі, якія працавалі пры будове аўтастрады з Вены ў Брэслаў праз тэрыторыю Чэхаславаччыны... З другога боку палк. Коц у Лёндыне вядзе гутаркі аб крэдытах для Польшчы, а ў пачатку красавіка ў Лёндын мае ехаць і мін. Бэк...

А. В.

ЗАЦЕМКІ З ЖЫЦЬЦЯ.

Ці пан не баіцца? „Кур. Віл." (10.III) зьмясьціў трохі загадковы і даволі запутаны артыкул пад заг.: „Czy pan nie obawia się zabrania Wileńszczyzny przez Białorusinów"? З якой мэтай зьмясьціў „Кур. Віл." гэты артыкул — згадаць трудна. На пачатку артыкулу сьцьвярджаецца, што ёсьць людзі — і то на высокіх становішчах, якія баяцца забраньня беларусамі Віленшчыны, але ў канцы робіцца вывад, што баяцца беларусаў няма чаго... Да гэтага вываду „Кур. Віл." даходзіць апіраючыся на славах Адольфа Бохэнскага (рэдактара варш. „Polityki"), які кажа, што польска-нямецкая вайна ня была-б для Нямеччыны надта прыемнай і магла-б скончыцца забраньнем Усх. Прусіі. „Аб сытуацыі, якая яшчэ не належыць да гісторыі — кажа А. Бох. — трудна гаварыць, бо публіцысты ня ведаюць усіх элемэнтаў, скрытых у тайніцах дыплямацыі. Адно пэўнае: Польшч мусіць імкнуцца да ўтрыманьня незалежнасьці ўсіх малых дзяржаў на сваіх граніцах і да паўстаньня магчыма як найболей такіх дзяржаў коштам Расеі". У гэтым ляжыць праграма промэтэізму. Калі гэта станецца, кажа далей Ад. Бох., Польшч можа не баяцца ані Украіны, якая паўстане на абшары Расеі, ані Літвы, ані якой іншай дзяржавы. Да гэтага „Кур. Віл." дадае ад сябе, што калі ня трэба баяцца ўкраінцаў, дык тымбалей беларусаў...

З гэтага артыкулу відаць, што некаторыя польскія дзейнікі баяцца, каб створаная на прасторы Сав. Расеі Беларусь не заявіла сваіх прэтэнсіяў да Віленшчыны. Гэтакі ёсьць, здаецца, сэнс успомненага артыкулу.

Польскае праваслаўе. У тым-жа нумары „Кур. Віл." зьмяшчае вестку, што 7.III. у Наваградку адбыўся зьезд палякаў праваслаўнага веравызнаньня. Пасьля набажэнства ў царкве сьв. Барыса і Глеба зьезд быў адчынены др. Карузіным; з прывітаньнем выступілі: Наваградзкі ваявода, прадстаўнік арміі і інш. Ідэолёгічны рэфэрат на зьезьдзе прачытаў праваслаўны ксёндз Каспэрскі, які адзначыў, што былі і ёсьць праваслаўныя палякі і што ўжо выданы для праваслаўных малітаўнікі ў польскай мове. Далей кс. Каспэрскі заявіў, што „Польскі Аўтакефальны Праваслаўны Касьцёл павінен быць баяўнiком (szermierzem) польскае культуры. Ён павінен слаўна выканаць сваю місію стаяньня на стражы Польскае Дзяржавы і дабра ягоных грамадзян". Потым быў адчытаны статут Сувязі Прав. Палякаў і выбраны ўрад Сувязі на Навагр. Ваяводзтва. Гэты ўрад мае закладаць паветавыя і мясцовыя гурткі Сувязі.

Як бачым, польская палітыка сыстэматычна і консэквэнтна ідзе да ўгрунтаваньня **польскага** праваслаўя. Спачатку ў Беластоку, потым у Горадні, Вільні, а цяпер і ў Наваградку закладаюцца арганізацыі праваслаўных палякаў. У даўнейшых часох (XVI—XVIII стагодзьдзі) польская палітыка імкнулася праводзіць свае мэты на ўсходзе пры помачы ўніі, цяпер-жа хоча пашыраць свае ўплывы пры помачы польскага праваслаўя. Унія ў цяперашніх часох, паводле пракананьня польскіх палітыкаў, зьяўляецца прыладаю ўкраінскага і беларускага нацыяналізмаў, а гэта для Польшчы небясьпечна.

Гітлероўцы ў Вільні. Пад гэтакім загалоўкам віленскае выданьне „Роботніка" (10.III) прыносіць вестку такога зьместу: „У апошніх часох у Вільні заўважыліся спробы зарганізаваньня тутэйшых, нямногіх на лік, немцаў у арганізацыі з гітлероўскім кірункам. Гэтая акцыя давяла да паўстаньня ў Вільні аддзелу „Jungdeutsche Partei". Нядаўна адбылося арганізацыйнае сабраньне віленскіх гітлероўцаў. Сабраньне было закончана адпяяньнем песьні „Horst-Wessel-Lied", якая ёсьць, як ведама, гітлероўскім гімнам. Гітлероўская пэнэтрацыя (пралажваньне) на землі, заселеныя ў вялікім працэнце беларускім жыхарствам, мусіць зьвярнуць нашую ўвагу — кажа „Роботнік". Гітлероўскія пляны адарваньня Беларусі і Украіны ад СССР і стварэньня з іх васальных дзяржаў Трэцяга

Гарадзкая і вясковая інтэлігенцыя.

Мы не адноўчы падчырківалі вялікае значэньне нацыянальнае інтэлігенцыі ў жыцьці народу. Мы, беларусы, маем сваю інтэлігенцыю ў горадзе і на вёсцы. Інтэлігенцыя наша паклікана да цяжкой, але ўдзячнай працы. Ня трэба даказваць, што рэзультаты гэтае працы залежаць ад таго, ці інтэлігенцыя працуе расьцярушанымі ці злучанымі сіламі, ці ў працы кіруецца якімсь абдуманым плянам, або наадварот, працуе несыстэматычна і бесплянова. Злучэньне сілаў нанацыянальнае інтэлігенцыі і падпарадкаваньне іх абдуманаму пляну — гэта першы варунак памыснае працы. Інтэлігенцыя гораду і вёскі павінна сабе ўцяміць, што яна творыць адну сям'ю — кадру, што між ёй ня можа быць розьніц, што праца ў горадзе і на сяле ёсьць аднолькава вартаснай і неабходнай.

Праўда, гарадзкая інтэлігенцыя, звычайна, бывае больш адукаванай, лепш ар'ентуецца ў вагульнай сытуацыі, але гэтыя прыметы ні ў якім прыпадку ня могуць нарушаць роўнасьці між ёй і вясковай інтэлігенцыяй, бо гэтым аргумэнтам можам проціўставіць, што вясковая інтэлігенцыя бліжэй стыкаецца з народам, лепш яго ведае, хутчэй можа знайсьці лякарства на розныя балячкі жыцьця. Можна сказаць нават больш: дыягноза пастаўленая сьведамай вясковай інтэлігенцыяй павінна быць паказчыкам і ў працы інтэлігенцыі гарадзкой. Калі, прыкладам, вясковая інтэлігенцыя гаворыць аб патрэбе якіхсь выдавецтваў, горад павінен натужыць ўсе сілы, каб іх даць; калі з вёскі сыгналізуюцца якіясь шкодныя праявы жыцьця, горад повінен у першую чаргу абдумаць спосабы змаганьня з імі і г. д. Толькі пры існаваньні гэтых цесных узаемаадносінаў між горадам і вёскай магчымым і поступы ў працы.

Прыглядаючыся да нядаўнае нашае мінуўшчыны і сучаснасьці, мы, нажаль, ня можам сказаць, каб у нас існавала пэўная гармонія між вясковай і гарадзкой інтэлігенцыяй. На гэты факт зьвярнулі ўвагу розныя нашыя непрыяцелі і ён даў ім аказію крычаць, што беларуская інтэлігенцыя ў горадзе адарвалася ад вёскі, што апошняя ня цікавіцца „гарадзкімі павадырамі", далей гэтыя-ж непрыяцелі шыраць нават пагляд, што ўвесь беларускі рух рэпрэзэнтуе кучка гарадзкіх інтэлігентаў і што хопіць гэтых інтэлігентаў зьліквідаваць, каб беларускі рух загінуў сам сабою. Ясна, што пагляд гэты недарэчны, але ўсё-ж трэба зірнуць глыбей ў гэтую справу і дагледзіць, ці часамі сама беларуская інтэлігенцыя ў некаторай ступені не спрычынілася да яго паўстаньня. Павярхоўны агляд нядаўна перажытай мінуўшчыны паказвае, што, запраўды. і з боку беларускае інтэлігенцыі ня ўсё было ў парадку; што віна спадае ў значнай ступені і на яе самую.

У чым-жа выявіліся гэтыя пахібы, выклікаўшыя перш-на-перш разрыў вёскі ад гораду?

Трэба згадзіцца з тым, што беларускі нацыянальны рух ёсьць адносна маладым. Кажны малады рух ня можа зьнесьці разьбіваньня. У маладым руху кожны разлом адбіваецца непрапарцыянальна балючэй, як у старым, пусьціўшым ужо глыбокія корані. А разломаў у нас было шмат. Выклікалі іх „вялікія" і „малыя" ідэолёгічныя шляхі, ды цёмныя сілы. Інтэлігенцыя гарадзкая разьбівалася, дзялілася, ды гэтыя свае падзелы перакідвала на вёску. У некаторай ступені гэта ўдавалася. Адны групы гінулі, але расьлі іншыя, ня лепшыя.

Увесь гэты працэс сьмерці і нараджэньня патрабаваў шмат ахвяр як з боку гарадзкой так і вясковай інтэлігенцыі. Спатыкаўшыя і самых „павадыроў" няўдачы падрывалі веру ў правільнасьць іхняга кіраўніцтва і зьнеахвочвала вёску. Ахопленыя інтэрнацыянальнымі плынямі павадыры, як ніяк, сьведамыя беларусы, не лічыліся з гэтай адноснай моладасьцю беларускага руху, нават і з тым, што ані агульныя палітычныя варункі, ані нацыянальныя і сацыяльныя мэты бел. народу ні ў якім прыпадку не апраўдывалі гэтых разломаў. Трагізм гэтых інтэлігентаў быў у тым, што ўбачыўшы „зорку на ўсходзе", яны прынялі яе за сонца і шчыра ў гэтаж верылі, ды даказвалі іншым трапнасьць сваей спасьцярогі. Трэба думаць, што

На беларускім грунце

ПРЫЧЫНЫ ПАДЗЕЛУ НА ГРУПЫ.

У вадным з папярэдніх нумароў „Бел. Фронту“ (1.II.39) мы затрымаліся шырэй над падзелам бел. вёскі на розныя групы і кірункі. Мы тады адзначылі, што на бел. вёсцы існуюць 4 групы: русафілы, кар'ерысты, сьведамыя беларусы, пасыўная маса. Цяпер, на аснове тых матар'ялаў, якія мы атрымалі з вёскі, прыгледзімся **да прычын,** якія выклікалі гэтакі падзел.

Мы ўжо няраз адзначалі, што русафільская група ў бел. народзе, які апынуўся ў граніцах Польшчы, вельмі сільная. Прычын „усходняй“ ар'ентацыі многа. Перш-на-перш трэба адзначыць даўнейшыя сымпатыі да вялікай прасторнай Расеі, куды можна было выехаць на заработкі або і зусім эміграваць. Старэйшае пакаленьне з любасьцяй успамінае „добрае даўнейшае жыцьцё“. За ім ідзе і частка маладзейшага пакаленьня. Да гэтага далучыліся яшчэ весьці аб будаўніцтве ў Расеі новага грамадзкага ладу, які мае направіць грамадзкія адносіны і завесьці лад лепшы і справядлівейшы... Таёмныя весьці аб гэтым ладзе пашыраны па ўсей краіне, асабліва, куды даходзіць савецкае радыё. Фактам, якія сьведчаць аб тым, што і там ёсьць свая бяда, ня вераць. Роўнадушна адносяцца да нішчэньня беларускай культуры ў Саветах і беларускіх культурных і грамадзкіх працаўнікоў. Часам кажуць: так ім і трэба. У такіх ня выклікала спагаднасьці нават ліквідацыя грамадаўцаў і змаганцаў, бо на іх глядзяць як на свайго роду „сэпаратыстаў і здраднікаў“.

Далейшымі прычынамі русафільскай ар'ентацыі ёсьць цяжкое палажэньне беларусаў у Польшчы і адносіны польскага ўраду да беларускага пытаньня. Беларускае насельніцва хоць маўчыць, але моцна адчувае ўсякую крыўду і заварочваецца на ўсход, думаючы, што там лепш... Згэтуль паўстала пракананьне пасярод некаторых кругоў аб камуністычнай ар'ентацыі вялікай часьці бел. насельніцтва ў Польшчы. Аднак гэтакае прakананьне ня зусім справядлівае. Каб выясьніць, які „камунізм“ пануе пасярод прыхільнікаў усходняй, русафільскай ар'ентацыі, мы пададзём адзін факт. Было гэта некалькі гадоў таму назад. У дыскусіі з такім „камуністам“ было пастаўлена пытаньне ў гэтакай форме: „Ну добра, вы ар'ентуецеся на Саветы і на Сталіна, якога ўважаеце за геніяльнага чалавека. А што-б вы зрабілі тады, калі-б у Маскве сядзеў Пілсудскі, а ў Варшаве Сталін? Куды-б Вы ар'ентаваліся“? На гэтакае пытаньне „камуніст“ прызадумаўся, а пасьля адказаў: „А ўсёж-такі на Маскву“. Гэты адказ вельмі добра сьведчыць аб „камунізьме“ нашых русафілаў. Значыць, у кожным прыпадку русафілы будуць ар'ентавацца на Маскву, хоцьбы там сядзеў фашыст (камуністы Пілсудскага называлі фашыстам).

Прычыны ўтварэньня групы кар'ерыстаў агульна ведамы: асабістая карысьць і значэньне. Кар'ерыст за пару залатовак зробіць усё. Дзеля гэтага на вёсцы цяпер пайшла вялікая таньніна на людзкія душы. Даўней, кажуць, чорт купляў душы і плаціў нават добрую цану ды яшчэ ў „залатой валюце“, а пяпер гэтага няма, прадаюцца за серабро, за паперкі, за што папала. І прадаюцца кожнаму, налева і направа, хто толькі хоча купіць. Дзеля гэтага людзкая душа страціла сваю вартасьць, а вырасла правакацыя, якая купляе, прадае, таргуе душою нашага чалавека.

Гэтакі невясёлы малюнак вясковага жыцьця рысуюць нашы карэспандэнты.

НЕПАТРЭЗНАЯ ЦЯГАНІНА.

Яшчэ адзін факт, (з Лідчыны) які сведчыць аб вясковым жыцьці, але ўжо іншага характару. У апісаньні гэтага факту будзем дзяржацца стылю і сказаў, якія паданы ў пісьмах.

„У гэтым годзе прычапіліся да мяне з гміны Д., што ў мяне не запл. падатак за зямлю за папярэдні год, але за які, няведама. Мяне ня было дома і хаця жонка паказвала квіты, ўсё кажуць, ня тыя. За гэты няведамы падатак апісалі цялушку. Прыехаў я да хаты, бяда, жонка кажа, чаго ты глядзіш, якога ты не заплаціў падатку? Калі я паглядзеў на гэту опісь, віджу, стаіць нумар наказу за год 1936, найшоў квіт балазей, а каб згубіў, плаці нанова. Паехаў я аж 11 клм., каб паказаць сэквэстратару квіт. ён кажа, трэба да гміны. Калі паслаў квіт праз суседа ў гміну, яны перакапалі, кажа, ўсе кнігі і сказалі, што гэта будзе за 1934 г. і ўжо напісалі на гэтай опісі, што за год 1934. Калі прыехаў сэквэстратар па цялушку, я ему тыц пад нос; ён кажа, што нічога ня будзе, трэба ехаць ізноў да самой гміны, паказаць і гэты квіт. Да гміны 15 клм. Паехаў я ізноў, а калі паказаў я і гэты квіт, нейкая пані капалася, капалася па ўсіх кнігах, а потым кажа: нічога ня будзе, ў цябе не заплачаны падатак за 1933 год, а як ты, кажа, заплаціў за 1934 год, так узялі і перавялі за 1933 і так, кажа, астаўся незаплачаны падатак за 1934 год. Калі я сказаў, што найду напэўна і квіт за 1933 год, гэта пані сказала: прывязі, тады, кажа, я абачу і падатак гэты скасую. Праўда, падатак невялікі, а сколькі ім нарабіў бяды! Пачаў я трасьці свае лахмыткі, каб найці гэты квіт, палову дня перабіраў я паперкі і найшоў і гэты квіт, г. з. за 1933 год. Каб, скажам, баба або неграматны мужычок, так сколькі раз казаліб, столькі раз і плаціўбы. Я ня ведаю, ці гэта хто ў сваю кішэнь, ці так дзе, але гэта многа такіх здарэньняў, так што суседзі прасілі, каб напісаць у якую газэту, каб належныя ўлады зьвярнулі на гэта ўвагу“.

Гэтак піша наш вясковы карэспандэнт. Сапраўды, абразок сваею абразнасьцю моцна б'е па розных гмінных і сэквэстратарскіх парадках.

КАНЦЭРТ ХОРУ Р. ШЫРМЫ.

3. III. у залі Сьнядэцкіх У.С.Б. у Вільні адбыўся канцэрт бел. хору пад кіраўніцтвам гр. Рыгора Шырмы. Канцэрт быў наладжаны з нагоды 15 гадоў дзейнасьці на ніве беларускай песьні гр. Рыгора Шырмы. Канцэрт удаўся вельмі добра. Праграма была рознаякая, а выкананьне яе паказала вялікае выробленьне хору. Заслуга тут, ясна, належыць гр. Р. Шырме. Пад яго кіраўніцтвам хор выдаваўся паслухмяным інструмантам. М. Танк прадэклямаваў верш, які напісаў з нагоды юбілею. Публікі, як звычайна, было многа, а сярод яе можна было бачыць шмат сялян, прыехаўшых на „Казюка“ і наведаўшых канцэрт. Канцэрт ладзіў Бел. Студ. Саюз у Вільні.

З САВЕЦКАЕ БЕЛАРУСІ.

У Сав. Беларусі праводзіцца далей „рэформа“ беларускай граматыкі і правапісу ў кірунку збліжэньня беларускага языка да расейскага. Як ведама, гэтакая „рэформа“ была ўжо раз праведзена дэкрэтам з дня 28. VIII. 1933 году, цяпер-жа праводзіцца яшчэ болей, каб бел. правапіс і граматыку зусім упадобніць да расейскага языка.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛІТВЕ.

Дня 26.II.39 адбыўся агульны сход сябраў Бел. Культурна-прасьветнага Т-ва. Пасьля справаздачы з дзейнасьці быў выбраны на наступны год урад з С. Якавюком на чале.

Тагож самага дня адбыўся сход Беларускай Нацыянальнай Сувязі ў Літве. Справаздачу з дзейнасьці Сувязі зрабіў адв. У. Боеў, урад на наступны год выбраны тойсамы з адв. У. Боевым на чале, як старшынёю. Дзьве ўспомненыя арганізацыі знаходзяцца ў цесным паміж сабою супрацоўніцтве.

Райху бязсумлюўна знойдуць гарачых прапагатараў сярод віленскіх гітлероўцаў“.

Гэтак піша „Роботнік“. Мы ня ведаем, ці ўсё гэта праўда, што піша „Роботнік“. Аднак няма дыму без агню. Відаць нейкая нямецкая арганізацыя залажылася ў Вільні. І гэта ў той час, калі беларускія арганізацыі ў Вільні ня існуюць! Якая іронія палажэньня!

„Тактыка“ п. Cat-Мацкевіча. Рэдактар віл. „Слова“, п. Ст. Мацкевіч, пішучы пад псэўданімам Cat (Кэт), затрымліваецца ў „Слове“ (12.III) над справай жыдоўскай і робіць даволі трапную спасьцярогу кажучы, што „разсеяньне“ жыдоўскага народу па ўсім сьвеце вылывае ня так з гневу Яговы, як з псыхікі жыд. народу. Гэты народ ня можа жыць аддзельна ад іншых народаў і жыве толькі паміж іншымі народамі і з іншых народаў, як нарасьці на дзераве жывуць з таго дзерава. Каб, напрыклад, кажа далей Cat, высяліць палякоў з „Кангрэсоўкі“ і там пасяліць усіх жыдоў, дык яны па пэўным часе ізноў распаўзьлісяб па сьвеце...

Разам з гэтым п. Cat кажа, што ён прапануе даць жыдом у Польшчы жыд. унівэрсытэт, але гэтакай прапазыцыі ня робіць адносна беларусаў і ўкраінцаў, бо гэтыя ня толькі прыняліб ягоную прапазыцыю, але яшчэ зьявілісяб у рэдакцыю „Слова“ з падзякай. Усё магчыма. Гэта залежылаб ад тактыкі адных і другіх. Нас тут дзівіць тактыка п. Cat'a, якая зьмяшчаецца ў тым, каб даваць „меншасьцям“ у Польшчы тое, чаго яны ня хочуць, а не даваць таго, чаго хочуць. Асаблівўшая „тактыка“!

Сьмерць Л. Абрамовіча. Дня 9.III. памёр у Вільні б. рэдактар „Przeglądu Wileńskiego“ грам. Людвік Абрамовіч, маючы 60 гадоў. Быў ён найвыдатнейшым прадстаўніком г. зв. краёвай думкі, вясьціўшай згоднае сужыцьцё ўсіх народаў, населяючых наш край. Да беларусаў адносіўся вельмі прыхільна і многа месца прысьвячаў у сваей газэце беларускім справам. Пахаваны на „Росах“. **Вечная яму памяць!**

дайшоўшы да свае мэты, г. ёсьць „усходняе зоркі“, яны зразумелі, сваю памылку, зразумелі непатрэбнасьць вялізарных ахвяр, але направіць было ўжо позна.

Асьлепленыя „правільнасьцю“ сваіх пагдядаў павадыры групаў ня любілі інакш думаючых, а нават між сваімі аднадумцамі не хацелі чуць ніякай крытыкі. Паступова вытварылі гэткае палажэньне, што на першы плян высоўваліся групы інтэлігентаў, лічучых, што толькі яны могуць апякавацца ўсімі. У лік гэтых патрабуючых апекі была залічана ўся вясковая інтэлігенцыя. Вёска павінна была толькі слухаць, што ёй гаворыцца, ды падпарадкавацца. Пагляд зусім памылковы, бо ён забіваў усякую ініцыятыву вясковае інтэлігенцыі, апраўдываў яе бязьдзейнасьць, сьпіхаў адказнасьць выключна на „апякуноў“. Шкоднасьць гэткага апякунскага адношаньня гарадзкіх інтэлігентаў да вясковых нязвычайна вялікая. Гэтае „апякунства“ выхоўвае з вясковае інтэлігенцыі бязвольную масу, якая будзе толькі чакаць лепшае будучыні і нічога дзеля яе здабыцьця не рабіць. Апынуўшыся без апякуноў, яна ня зможа іх выдзеліць з сябе і разбрыдзецца. Ізноў-жа вартасьць павадырства гарадзкой інтэлігенцыі, трымаючай у сваіх руках гэгэмонію над вясковай, надта праблематычная, бо гэткае павадырства можа лёгка згубіць сувязь з асноўнай базай.

Гэтыя дзьве прычыны: разломы і апякунства — аслабілі сувязь між вясковай і гарадзкой інтэлігэнцыяй і выклікалі вялікшую ці меншую бязьдзейнасьць першай. Замест аднае цэласьці, паўстаў непатрэбны падзел, у якім адны прыглядаюцца да другіх. Горад гнецца пад цяжарам адказнасьці, тады як вёска, пакінуўшы ініцыятыву і кіраўніцтва, чуе сябе свабоднай з гледзішча гэтай адказнасьці. Частка вясковае інтэлігенцыі часта ўважае, што выпісваючы, скажам, беларускія газэты, яна ўжо цалком спаўняе свае абавязкі перад грамадзянствам.

З друкаваных у беларускай прэсе карэспандэнцыяў з вёскі мы бачым, што вясковая інтэлігенцыя пераважна спыняецца на апісваньні розных здарэньняў і на падаваньні іх да публічнага ведама, але сама ня шукае выхаду, пакідаючы гэта інтэлігенцыі гарадзкой. Падобны падыход ёсьць цалком фальшывы, а тлумачыцца ён тым, што частка вясковае інтэлігенцыі і далей хоча бачыць над сабой апеку і хоча аставацца без ініцыятывы. Часта, напрыклад, чытаем ў пісьмах з вёскі трапныя спасьцярогі аб патрэбе беларускае асьветы, аб шкоднасьці гарэлкі, бойкаў і г. д., але мала спатыкаем выпадкаў, каб вясковая інтэлігенцыя шляхам самаасьветы і навучаньня шырыла беларускую сьведамасьць, веду, байкатавала пьяніц, выступала проціў пьянства, проціўдзеяла бойкам і г. д. Важна тут ня простае апісаньне якогась шкоднага здарэньня, але тая **рэакцыя,** якую гэта здарэньне выклікала сярод здаровае часткі народу. Заданьнем вясковае інтэлігенцыі было-б якраз выклікаць гэта проціўдзеяньне, выказаць уласную ініцыятыву, а не аглядацца на горад, ды не складаць бязпомачна рук. Але гэткі парадак магчымы толькі тады, калі вясковая інтэлігенцыя зразумее, што адказнасьць за непамысныя праявы жыцьця на вёсцы спадае ў значнай меры і на яе самую, калі прыме на сябе часьць адказнасьці перад народам, калі вызваліцца ад патрэбы апекі, а прызнае сябе паўнавартаснай часткай беларускай інтэлігенцыі, роўнай гораду. Толькі пры гэткім падыходзе магчымай будзе разнаякая ініцыятыва ў вясковай інтэлігенцыі. якая нават пры сучасных цяжкіх варунках беларускага жыцьця можа памысна выявіцца ў разнаякіх галінах нацыянальна грамадзкай працы.

Цяпер, калі мы бачым вельмі памысную агульную кансалідацыю беларускае інтэлігенцыі ў краі і заграніцай, неабходна, каб маса нашае вясковае інтэлігенцыі зразумела сваю высокую ролю, да адыграньня якой паклікана і, звольніўшыся ад вышэйменаваных псыхолёгічных путаў, разьвярнула поўнасьцю сваю ініцыятыву. Поле дзеяньня ёсьць надта шырокае і працы многа. Шукаць яе ня трэба. У брацкай лучнасьці з гарадзкой наша вясковая інтэлігенцыя будзе тады ў поўным сэнсе слова павадыром народных масаў.

М. Ш.

На міжнародным грунце

НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ СЛАВАКІІ. ВУГРЫЯ ЗАЙМАЕ КАРП. УКРАІНУ, А НЯМЕЧЧЫНА ЧЭХІЮ.

Апошнія тэлеграмы прынясьлі вестку, што дня 14.III.39 Славацкі Сойм абвесьціў Славакію вольнай і незалежнай дзяржавай. Сталася гэта пасьля візыты прэм'ера Тіссо ў Гітлера. Аружныя нямецкія сілы ізноў сканцэнтраваны каля Чэхаславаччыны. На чале славацкага ўраду стаў Тіссо, у ўрад увайшлі ўсе ўсунутыя і арыштаваныя чэхамі міністры.

Абвешчаньне незалежнасьці Славакіі стварае новы ўклад палітычных сіл ня толькі ў д. Чэхаславаччыне, але і ў суседніх дзяржавах. Тэлеграмы прынясьлі весьці, што на граніцы Вугрыі і Карп. Украіны пачаліся бітвы, пры гэтым вугры пасунуліся ўперад, займаючы цэлы рад вёсак. Відаць, Вугрыя, карыстаючыся з абвешчаньня незалежнасьці Славакіі, хоча далучыць да сябе Карп. Украіну і стварыць супольную з Польшчай граніцу.

Польшч сканцэнтравала войска на граніцы Карп. Украіны. Чэскі прэз. Гаха і мін. Хвалькоўскі паехалі да Гітлера і прасілі ўзяць у абарону Чэхію. Нямецкая армія ўвайшла ў Прагу. Чэхаславаччына перастала існаваць. Падзеі разьвіваюцца.

АГУЛЬНЫ АГЛЯД.

Перад агульным аглядам палітычнага жыцьця, трэба адцеміць важную падзею з рэлігійнага жыцьця, а гэтай падзеяй ёсьць **выбары новага Рымскага Папы** (2.III), якім стаў кардынал Аўгень Пачэльлі, які прыняў імя свайго папярэдніка і назваўся **Пій XII.** Выбары Папы Пія XII выклікалі здаваленьне ў „дэмакратычных“ дзяржавах, а засьцярогі ў фашыстоўскіх, асабліва ў Нямеччыне.

* * *

У першай палавіне сакавіка трохі выясьніліся рэзультаты эўрапэйскай мабілізацыі сіл, як на Захадзе, так і на Ўсходзе. На Захадзе, як відаць, Гішпанія не пайшла на старану восі Парыж—Лендын (аб прычынах мы пішам ніжэй), Бэльгія хістаецца, куды ісьці, нованазначаныя выбары ў парлямант маюць выясьніць яе становішча. Урэшце Бэльгіі гразіць дзяржаўны крызыс і падзел на дзьве часьці: Валёнію і Флямандыю. Галяндыя здэцыдавана стаіць на старане восі Парыж—Лёндын, (з гэтай восяй вяжуць яе супольныя каляніяльныя інтарэсы). На Ўсходзе Грэцыя, Турцыя, Югаславія, Румынія, схіляюцца на старану восі Парыж—Лёндын, Баўгарыя, Вугрыя, Славакія, Карп. Украіна — на старану восі Рым—Бэрлін, аб Польшчы мы пішам на іншым месцы. Прыбалтыцкія дзяржавы (Літва, Латвія, Эстонія) маюць сымпатыю да восі Парыж—Лёндын, а Фінляндыя — да восі Бэрлін — Рым. Ляжачыя ў старане Скандынаўскія дзяржавы хочуць быць цалком нэўтральнымі, але нутраныя іх сымпатыі болей на старане восі Лёндын — Парыж. Гэта ёсьць агульны агляд палітычнай сытуацыі ў Эўропе. Ясна, што гэта сытуацыя можа яшчэ зьмяніцца (бо палітыка ёсьць рэчай вельмі зьменнай), але агулам бяручы контуры палітычнай карты Эўропы цяпер даволі выразны.

ЯК СТАЛІН ХАРАКТЭРЫЗУЕ ПАЛІТЫЧНАЕ ПАЛАЖЭНЬНЕ?

10. III. быў адчынены ў Маскве 18 Кангрэс Камуністычнае партыі, на якім Сталін так схарактэрызаваў сучаснае паліт. палажэньне. Вайна за перадзел сьвету, казаў Сталін, фактычна вядзецца ўжо ад 1935 г. у Азіі, Афрыцы і Эўропе. Ніякія „восі“, „трыкутнікі“ і „антыкамуністычныя пакты“ ня могуць скрыць факту, што ў гэтым часе Японія заўладала аграмадным прасторам у Кітаі, Італія — Абісыніяй, Нямеччына — Аўстрыяй і Судэтамі, а Нямеччына і Італія супольна заўладалі Гішпаніяй. Гэтак званы „антыкамінтэрнаўскі пакт“ выразна скіраваны процў Англіі, Францыі і Злуч. Штатаў. Дэмакратычныя дзяржавы хоць сільнейшыя, аднак уступаюць перад дзяржавамі фашыстоўскімі і прычын уступлівасьці ня трэба шукаць у іхнай слабасьці. Палітыка неўмешваньня, практыкаваная Англіяй і Францыяй вядзе да напасьлівасьці і ваенных канфліктаў.

Вельмі характэрныя словы прысьвяціў Сталін украінскай справе, ўзьнятай на бачынах францускай, англійскай і амэрыканскай прэсы. Сталін думае, што ўвесь гэты падазроны шум меў на мэце прабудзіць гнеў Савецкага Саюзу процiў Нямеччыны, атруціць атмасфэру і справакаваць вайну бяз выразнай прычыны. Магчыма, што існуюць у Нямеччыне шалёныя людзі, якія думаюць далучыць сланя, г. зн. Савецкую Украіну да камара, якім ёсьць Карпацкая Украіна. Але для такіх людзей знойдуцца ў Саветах „кафтаны бясьпечнасьці“. Нямеччына паводле Сталіна, зрабіла заходнім дзяржавам разчараваньне, бо замест ісьці на ўсход, павярнула на захад і жадае калёніяў. Выглядае, што яны ўступілі Нямеччыне Чэхаславаччыну з тым, каб Ням. ішла на ўсход процiў Савецкага Саюзу, але цяпер немцы адказваюцца споўніць сваё забавязаньне. Цяпер Англія і Францыя ўжо ня вераць у „мюнхэнскую эру“ і дзеля гэтага ўваружаюцца. Гэтае самае робіць і Савецкі Саюз!

Як бачым у славах Сталіна спасьцерагаюцца „цёплыя ноткі“ адносна Нямеччыны.

ЯШЧЭ АБ НЯМЕЦКІХ ПЛЯНАХ.

А француская прэса далей разводзіцца над нямецкімі плянамі на Усходзе. Гэтак, пашыраны часапіс „Ilustration“ зьмясьціў пагляды быццам аднаго з выдатных нямецкіх павадыроў, які гэтак казаў: Чэраз Прыкарпацкую Русь закранём справу самастойнасьці цэлай польскай Украіны, паіменна цэлай Усходняй Галіччыны, Волыня і Палесься, апіраючыся на права самаазначэньня народаў. У хвіліне, калі агітацыя дойдзе да найвышэйшага пункту, Нямеччына вышле неспадзявана ў Варшаву ўльтіматум, жадаючы звароту карыдору і Горнага Шлёнска. Чэхам абяцаем аддаць Цешын, калі яны нас падтрымаюць. Польшч будзе прымушана пакарыцца, таксама, як гэта зрабіла ў верасьні Чэхаславаччына, бо ніхто не захоча яе бараніць... Польшч будзе зьменена на унію трох сфэдэраваных дзяржаў, якая абойме палякоў, беларусаў і ўкраінцаў, есьлі ўкраінскія землі не будуць адразу зарганізаваны у самастойную дзяржаву. Польшч будзе прымушана зьвярнуць карыдор і Шлёнск; пакінуць ёй Пазнаншчыну... Расейская і польская Украіна будуць тварыць некалі 40 мільённую дзяржаву. Фюрэр здэцыдаваны стварыць гэту дзяржаву не як нямецкую калёнію, але як саюзьніка. Істотнаю мэтаю Нямеччыны ёсьць выкарыстаць Украіну ў паходзе на Каўказ і да яго багацьцяў. Немцы хочуць зрабіць скок па Польшчы і Чэхаславаччыне ў кірунку Савецкай Расеі, апіраючыся на клічы самаазначэньня народаў. Усе вызваленыя гэтакім спосабам народы будуць зарганізаваны ў вялікую Лігу Народаў, якою будзе кіраваць Бэрлін. Немцы лічаць у гэтых плянах на падтрыманьне Італіі, якой сваім парадкам памогуць да здабыцьця Тунісу і апірышча на Міжземным моры. Вочавідная рэч, што Італія не пасьмее сягнуць па Туніс, пакуль Нямеччына не сканцэнтруе ўсей сваей арміі на францускай граніцы.

Гэтакія быццам ёсьць нямецкія пляны паводле „Ilustration“. Львоўскае „Słowo Narodowe“ (5. III. 39), якое гэтыя весткі перадрукавала, так піша: „Няма ведама, ці Гітлер мае сапраўды гэтакі плян, які яму прыпісвае „Ilustration“. Магчыма што ідзе тут пра францускую прапаганду ў Польшчы (запужваньне нямецкай небясьпекай, каб павярнуць Польшч у бок Францыі—рэд.). З другога боку, кажа далей „Сл. Нар.“, мы ня ёсьць пэўны, ці Нямеччына не задумывае нічога процiў нас. Дзеля гэтага добра будзе, калі Польшч прыгатуецца на тое, каб нямецкім плянам і нямецкай волі процiўставіць польскія пляны і польскую волю“.

Гэтыя весткі мы ўзялі з украінскага часапісу „Батьківщина“ (12. III. 39) выходзячага ў Львове.

КАЛЯ ГІШПАНІІ.

У Гішпаніі падзеі пайшлі ў зусім непрадбачаным кірунку, іменна, разьбітыя рэспубліканцы пачалі змагацца паміж сабою. Пасьля адрачэньня прэз. Азаны ад свайго становішча, процiў ураду прэ'мера Нэгрына, з ведама Англіі і Францыі, была зроблена змова вайсковых кругоў, нездаволеных ягонай палітыкай. Дзяржаўны пераварот удаўся, Нэгрын у апошнюю мінуту на самалёце ўцёк у Францыю, тудыж уцяклі і іншыя сябры гішп. чырвонага ўраду, а разам з імі ведамая Ля Пассіонарыя, гішпанская чэкістка. На чале новага ўраду стаў ген. Міаха, а дыктатарам рэсп. Гішпаніі — палк. Кассада. Нэгрыну закідаюць, што быў агентам чужых сіл (Саветаў). У абароне Нэгрына выступілі гішпанскія камуністы, процiў якіх ген. Міаха ўжыў артылерыі, танкаў і самалётаў. Пасьля тыднёвых крывавых бітваў, камуністы былі пераможаны — а тымчасам ген. Франко прыгатовіў новае наступленьне на Мадрыт і Валенцыю, якое мае пачацца 19.III. Рэспубліканскія ваенныя караблі з Картагены ўцяклі ў францускі порт Бізэрту (Туніс), дзе іх разаружылі.

Пасьля прызнаньня генэрала Франко Англіяй і Францыяй, гэтыя дзяржавы выслалі ў Гішпанію сваіх амбасадараў. Зьвярнуў увагу факт, што Францыя выслала на амбасадара ў Гішпанію вялікага абаронцу крэпасьці Вэрдэн (з Вялікай вайны) маршала Пэтэна. Левая франц. прэса пісала, што для ген. Франко гэта завялікая чэсьць. Гэта назначэньне паказвае, якую вялікую вагу мае Гішпанія для францускай палітыкі і як моцна хоча Францыя прыцягнуць ген. Франко на свой бок.

Аднак ген. Франко да восі Парыж-Лёндын прыбліжацца ня хоча. Ён мае іншыя пляны: **ён хоча адбудаваць даўнейшую магутнасьць Гішпаніі і вярнуць для яе землі ўтрачаныя на карысьць Англіі і Францыі.** А да гэтай мэты нац. Гішпанія можа дайсьці толькі ў саюзе з Ням. і Італіяй. Урэшце і Гібралтар, якім уладае Англія ляжыць на гішпанскай тэрыторыі, а гэта дражніць нацыянальную гордасьць гішпанцаў. За мяшок золата ген. Франко сваіх мэтаў прадаваць ня хоча. Кажуць нават, што трыкутнік Бэрлін-Рым-Токіё мае стацца чатыракутнікам, з дадаткам сюды яшчэ і Мадрыту, калі ён будзе ўзяты генэралам Франко.

З падзеямі ў Гішпаніі зьвязаны пляны Муссоліняга. Кажуць, што сваю прамову, адкладаную ўжо двойчы, ён мае сказаць 23.III., у якой ясна азначыць свае жаданьні. Паводле чутак, гэтыя жаданьні вялікімі ня будуць: ён зажадае правоў у Тунісе, у Суэскім канале і ў Джыбутті. Частка францускай прэсы піша, што каліб Муссоліні паставіў гэтыя жаданьні, дык яшчэ можна былоб згаварыцца — і тады няхай сабе ён разам з Гітлерам ідзе на ўсход...

У апошніх днях разыйшліся чуткі, што Чэмбэрлен у хуткім часе выступіць з праектам склікання вялікай міжнароднай канфэрэнцыі, на якой спачатку абгаварылася-б справа разаружэньня, а каліб гэта справа была вырашана памысна, канфэрэнцыя прыступіла-б да новага падзелу сьвету.

ПОЛЬСКА-НЯМЕЦКІЯ АДНОСІНЫ.

Абсэрвуючы цяперашнія поль.-ням. адносіны, прыходзім да пракананьня, што як адна так і другая старана высьцерагаецца завастрэньня адносін. Найболей важнай справай зьяўляецца цяпер урэгуляваньне ўзаемных адносін да нац. меншасьцяў: польскай ў Нямеччыне, а нямецкай у Польшчы. Перагаворы, якія адбываліся ў Бэрліне, прарваны, але паводле заявы мін. Бэка, маюць быць навязаны новыя. Перагаворы прарваны з прычыны вялікага разыходжаньня ў паглядах прадстаўнікоў аднэй і другой дзяржавы. „Warsz. Dziennik Naradowy“ (10. III) усьлед за „Kur. Warsz.“ піша, што немцы хочуць, каб Польшч паддала рэвізіі свае адносіны ня толькі да нямецкай меншасьці, але да ўсіх нац. меншасьцяў. Нямеччына гэтым самым выступае ў ролі іх пратэктара. На гэта Польшч згадзіцца ня можа. Такую тактыку Ням. пакінула Чэхаславаччыне, кажа „W. Dz. Nar.“ а Польшч ня ёсьць Чэхаславаччынай і дзеля гэтага такой тактыкі прыняць ня можа.

РОЗНЫЯ ВЕСТКІ.

— Прэса піша, што Гітлер, згаджаючыся на заняцьце Вугрыяй Капр. Украіны, адлажыў вырашэньне ўсходняе праблемы, пакуль ня вырашыць справы калёніяў.

— У Львове пачаліся студэнцкія забурэньні, якія ліквідуе паліцыя рашучымі спосабамі. Арыштавана да сотні студэнтаў. Пры здабываньні студэнцкіх (польскіх) дамоў, дзе мясьціліся студ. арганізацыі, былі раненыя.

— У Беражанскім павеце (Галіччына) закрыты ўсе ўкраінскія арганізацыі і гурткі лікам каля 170. Мэта ліквідацыі — ўспакаеньне павету, які адзначаўся рознымі антыдзяржаўнымі выступленьнямі.

Беларусы, калі хочаце ўсебакова пазнаць беларускую і сусьветную палітыку, выпісвайце „Беларускі Фронт“. Пашырайце яго пасярод сваіх суседзяў і знаёмых!

Рэдактар-выдавец:
мгр. В. Гадлеўскі.

Redaktor i wydawca: mgr. W. Godlewski.



Druk. M. Bogatkiewicza i B. Trućko. Wilno, ul. Ad. Mickiewicza 22-a, m. 30.